Кісялёў А. В. Рэгуляванне ўнутраннага гандлю на беларускіх землях у XVI – першай палове XVII ст. А. В. Кісялёў // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 4 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. — Минск: БГУ, 2009. — С. 102-106

**А. В. Кісялёў**

# РЭГУЛЯВАННЕ ЎНУТРАНАГА ГАНДЛЮ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XVI — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

Эканамічная гісторыя Еўропы ў ХУІ ст. выразна адрозніваецца ад папярэдніх. Вялікія геаграфічныя адкрыцці і каланізацыя Амерыкі прывялі да значнага пашырэння гандлю, які ператвараецца ў сусветны. Вялікая колькасць каштоўных металаў, у першую чаргу золата і срэбра, пачынае трапляць у Еўропу, шматразова павялічваючы грашовую масу. Гэта прывяло да значнай для таго часу інфляцыі, якая ў гістарыяграфіі атрымала назву «рэвалюцыя цэн».

**Гандаль паміж горадам і вёскай.** На розныя катэгорыі тавараў цэны раслі рознымі тэмпамі. Напрыклад, на прадукты харчавання цэны раслі ў два разы хутчэй, чым грашовая маса [3, с. 36]. Гэта было выклікана ў першую чаргу хуткім дэмаграфічным ростам і паскарэннем урбанізацыйных працэсаў у Еўропе [2, с. 125], апярэджвалі рост прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. Аграгэхналогія ў многіх рэгіёнах Еўропы захоўвалася на ўзроўні Сярэдневечча, напрыклад у Міжземнамор'і на працягу XVI і значнай часткі XVII ст. працягвала панаваць двухпольная сістэма севазваротаў [6, с. 203]. Паколькі збожжа з'яўлялася прадуктам першай неабходнасці, то Заходняя Еўропа вымушана была экспартаваць яго ва ўсё больш і больш узрастаючай колькасці, што прыводзіла да апераджальнага ў параўнанні з шэрагам іншых груп тавараў росту цэн. Як ужо адзначалася вышэй, пры тагачасным узроўні агратэхналогій у Заходняй Еўропе не хапала ні ўласных пашанных угоддзяў, ні патэнцыялу свабодных зямель для іх пашырэння. Таму пасевы пад збожжа пачалі пашыраць ва Усходняй Еўропе, дзе шчыльнасць насельніцтва была ніжэйшай і існавалі вялікія абшары лясоў і балот, якія можна было выкарыстаць для патрэб сельскай гаспадаркі. Мела месца таксама і паляпшэнне агратэхналогіі. На працягу XV—XVI ст. значнае распаўсюджванне тут атымліваюць замест двухпольных трохпольныя севазвароты, што дазволіла на 1/3 павялічыць прадукцыйнасць пасяўных плошчаў[5, с. 309]. У гарадскім жыцці XVI — першай паловы XVII ст., асабліва ва ўсходнім рэгіёне, быў моцна развіты аграрны накірунак. Нізкі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, дробная таварнасць большасці феадальных маёнткаў (не гаворачы пра сялянскую гаспадарку), шматлікія бедствы: войны, дрэнныя ўраджаі, эпідэміі — усё гэта прымушала гараджан займацца сельскай гаспадаркай. Аднак, нягледзячы на гэта, горад не меў магчымасці цалкам забяспечыць сябе сельскагаспадарчай прадукцыяй. Гэта абумовіла тую вялікую ролю, якую займала гандлёвая сувязь паміж горадам і вёскай у сістэме гандлёва-эканамічных адносін таго часу.

У шэрагу гарадоў ВКЛ заняткі сельскай гаспадаркай не мелі вялікага распаўсюджання. Так, напрыклад, насельніцтва Бярэсця ў XVI ст., якое займалася азначанай справай, склада-ла ўсяго 6, 2 % ад агульнай колькасці жыхароў горада, у Пінску — 9, 8 %, у Гародні — 6 %. [11, с. 157]. Але рост цэн на збожжа апярэджваў рост цэн на многія рамесныя вырабы і вымушаў многіх мяшчан, асабліва не заможных, займацца земляробствам. Пры пабочных сельскагаспадарчых занятках гарадскога насельніцтва абвастраліся міжсаслоўныя супярэчнасці. Мяшчане цікавіліся зямлёй, што не падабалася шляхце, бо яна падняла на сойме пытанне аб утварэнні ўмоў, якія перашкаджалі б

пераходу шляхоцкіх маёнткаў у рукі мяшчан Гандаль прадуктамі сельскай гаспадаркі быў даволі прыбытковай справай, за якую ўзяліся многія

**Киселев Александр Васильевич** — аспирант кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков Белорусского государственного университета



станы тагачаснага грамадства. Сярод іншых вылучаліся прадпрымальніцкія памкненні шляхты. На соймах сярэдзіны XVI ст. яна настойвала на бяспошлінным продажы збожжа і іншых прадуктаў, на ўвядзенні ў гарадах адзінай уніфікаванай меры вагі на зерне і іншыя прадукты сельскай гаспадаркі. [4, с. 117]

З'яўленне сялян, якія вялі рэгулярны гандаль у горадзе (так званыя «гандлёвыя людзі»), і рэальна мажлівы варыянт іх аселасці тут непакоілі вярхоўную ўладу. Аб гэтым сведчыць рэскрыпт Жыгімонта І гарадзенскаму старасце, у якім «Король Сігізмундъ І приписываеть старосте отсылать вь деревни крестьян, перешедших на жительство в городь и займающихся торговлею»[13, с. 23]. Не выключаны быў удзел у гандлі і вясковых рамеснікаў. Але невялікае распаўсюджанне гэтай з'явы было абумоўлена існаваннем у гарадах жорсткай цэхавай рэгламентацыі на гандаль таварамі рамяства.

Асноўным таварам, які вёз селянін на гарадскі рынак, было збожжа. У горада не было вялікіх плошчаў пад вырошчванне сельскагаспадарчых культур. Ён выкарыстоўваў любую магчымасць дзеля папаўнення сваіх сховішчаў. Да таго ж зерне адыгрывала значную ролю і ў замежным гандлі. Гарады з'яўляліся і павінны былі заставацца тым месцам, дзе канцэнтраваліся тавары, у тым ліку і збожжа, перад тым як іх перапраўлялі за мяжу. Дзеля гэтага нават ствараліся спецыяльныя рынкі ў Магілёве, Мсціславе, Гародні. Дарэчы, адносна месца хлеба ў экспарце краіны ў беларускай гістарыяграфіі існуе некалькі пунктаў гледжання. Аб значнай ролі гэтага тавара ў замежным гандлі пісалі У. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі [9, с. 57]. З. Ю. Капыскі сцвярджаў аб меньшай ролі збожжа ў гэтым працэссе. У сваіх даследаваннях ён абапіраўся на мытныя кнігі Бярэсця (1583 г.), Гародні (1600 г.), Коўна (1600 г.), Віцебска (1605 г.) і Полацка (1616 г.) [11, с. 17]. Азначаная праблема з'яўляецца прынцыповай пры разглядзе пытанняў развіцця ўнутранага рынку краіны. Замежны гандаль зернем, непасрэдным чынам уплываў на рынкавыя сувязі горада і вёскі. Бо дзякуючы экспарту ў краіну ішоў паток грошай з Еўропы, а гэта дазваляла пашыраць унутраны рынак.

Набывалі сяляне ў горадзе ў асноўным прадукцыю рамёстваў: косы, сякеры, вазы, адзенне і інш. Нягледзячы на панаванне ў той час натуральнай гаспадаркі, пры якой сяляне выраблялі для сябе ўсё самі, колькасці вясковых рамеснікаў было відавочна недастаткова, каб цалкам забяспечыць вёску рамеснымі вырабамі. Да таго ж, як мне падаецца, сялянскія рамесныя вырабы не маглі канкурыраваць з вырабамі гарадскіх майстроў ні па кошту, ні па якасці. Але ж месца на рынку мог мець і селянін. Праўда, часцей ён тут з'яўляўся, каб набыць нейкую рэч непасрэдна пасля продажу свайго тавару. Гэта значыць, што гандлёвая аперацыя насіла хуткатэрміновы характар. Але былі і выключэнні. Напрыклад, ва ўставе Стрэшынскай воласці 1618 г. гаворыцца аб трывалым гандлі сялян на рынку; яны захоўвалі свае прадукты ў арэндаваных мяшчанамі каморах» [1, с. 19].

З тавараў, якія прывозілі іншагародня гандляры у горад, браўся падатак на карысць магістрата. Акрамя гэтага былі і іншыя падаткі. Так, у прывілеі мястэчку Ліпску мы сустракаем «тарговае меснае» — грошы, што ішлі дзяржаве, і ад уплаты якіх былі вызвалены толькі мяшчане. У прывілеі магілёўскім мяшчанам 1536 г. вярхоўная ўлада дае наступнае вызначэнне гэтаму падатку: «А торговое такь уставуемь... мають они, подданые наши могилёвцы, на торгу купячи на месте, давати торговое оть коня по грошу... оть вола, або оть яловицы по полгроша узкого, а оть иншого быдла забитого мають давати по тому, яко и передь тымь здавна давали» [2, с. 45].

Наданы мястэчку ці гораду прывілей на вызваленне ад гандлёвых падаткаў яшчэ не даваў яго жыхарам поўнай упэўненасці ў атрыманні палёгкі. Часам дзяржаўца мог, нягледзячы на загад канцылярыі князя, працягваць спаганяць падаткі. Так, напрыклад, атрымалася ў мястэчку Філіпава, дзе дзяржаўца Аляксандр Гвагнін незаконна браў «торговое» і «померное». Да таго ж мяшчане абураліся : «Нежь кгды до торгу продованю збожя приедеть, тогды у того, хто приедеть, беруть по шелегу, того дей мы не повинны платити были, а ино зь людей прыежд



чыхь если беруть, тогды дей се то чинить ку знишченю того местечка, бо до торгу не ездять». У гэтым жа акце ўтрымліваецца і азначэнне паняцця «торговое»: «Што ся дотычеть торгового, то есть одь быдла вшелякого, оть статковь потребныхь, бочокь, кадей, рыб солоных на возехь прывезеныхь» [6, с. 43]. «Торговое», згодна ранейшым прывілеем дзяржавы гэтаму мястэчку, павінна было ісці на будоўлю ратушы і хрысціянскай школы [12, с. 243]. У Оршы напрыканцы XVI ст. «торговое» бралася з усялякага «збожья» і солада бочкі — па 4 пенезі, ад корца — па пенезю. Калі памеры не дасягалі вышэйпамянёных, падатак браўся «да вряда» [9, с. 56].

У схеме гандлёвых адносін горад — вёска адну з галоўных роляў адыгрывалі прасолы. Трохі падрабязней разгледзім, чым займалася азначаная група асоб. Ва ўставе магілёўскага купецкага брацтва даецца наступнае вызначэнне гэтаму паняццю: «это тот, кто не ездит по ярмаркам с иноземными товарами и здесь, в КП и ВКЛ, ими не торгует, а, покупая в городе товары, вывозит их продавать за город, на расстояние не свыше 10 миль» [9, с. 74]. Лавачны гандаль, як і гандаль з купецтвам, прасолам забараняўся. Перакупшчыкі і прасолы былі ў кожным горадзе і мястэчке. Іх абавязкі рэгламентаваліся прывілеямі каралеўскай улады, пастановамі магістратаў, уставамі брацтваў [12, с. 341].

Узрастала гандлёвая канкурэнцыя ў горадзе, сюды ехалі сяляне — патэнцыяльныя кліенты прасолаў. Каралеўская ўлада адказвала лістамі аб забароне сялянам збягаць у горад. Аб гэтым сведчыць рэскрыпт Жыгімонта I гарадзенскаму старасце Юрыю Мікалаевічу Радзівілу, у якім кароль загадвае старасце адсылаць на вёску сялян, што перайшлі у горад на жыхарства і займаліся гандлем [5, с. 202]. Кошт сыравіны і рамесных вырабаў на гарадскім рынку і ў вёсцы не быў аднолькавым. Гэтую розніцу і імкнуліся скарыстаць як прасолы у сваёй прафесійнай дзейнасці, так і феадалы-прадпрымальнікі, калі выкупалі гарадскую зямлю.

Акрамя мытных пабораў, дзяржава, магістраты гарадоў уносілі абмежаванні ў форму і характар гандлю селяніна ці мешчаніна. Звычайна сяляне ехалі ў горад на штотыднёвыя таргі, або кірмашы, дзе дазваляўся рознічны гандаль. У звычайныя дні сяляне маглі прадаваць свае тавары толькі оптам. Пры гэтым сялян тычылася значна меньшая колькасць абмежаванняў у гандлі, чым купцоў. Пашырэнню ўнутранага і знешняга гандлю садзейнічаў хуткі дэмаграфічны рост у ВКЛ. Такую зручную кан'юнктуру выкарыстоўвала дзяржава. Для сярэдневечнага грамадства было характэрным стварэнне ўнутраных, рэгіянальных мытняў, даходы ад якіх былі адной з асноўных крыніц фарміравання казны.

**Міжрэгіянальны гандаль.** У XVI ст. павялічваецца колькасць мытных камораў і прыкаморкаў (філіялаў камор ) на гандлёвых шляхах Вялікага княства. Назву гэтыя каморы звычайна бралі па гораду, ля якога будаваліся. Так, у першай палове XVI ст. у актах вярхоўнай улады можна сустрэць згадкі пра Віленскую, Полацкую, Смаленскую, Дарагіцкую, Бельскую, Менскую, Берасцейскую, Уладзімірскую, Віцебскую і шэраг іншых камор [13, с. 5]. Узрастанне іх колькасці сведчыла, з аднаго боку, аб пашырэнні ўнутраннага і транзітнага рынку, узрастанні гандлёвай актыўнасці (будаваць ці арандаваць камору на дарозе, па якой праязджала некалькі чалавек у месяц, ніхто, безумоўна, не стаў), з іншага боку — павялічвала колькасць бар'ераў, існаванне якіх

значна замаруджвала дынаміку ўнутрыгандлёвага жыцця. Мытнік павінен быў выконваць наступныя абавязкі. Па-першае, ён павінен быў весці справаздачную дакументацыю, якая афармлялася ў мытныя кнігі. Па-другое, арандатар мыта штогод (ці ў іншы тэрмін згодна кантракту) прадстаўляў вярхоўнай уладзе «лічбу» — дакумент, у якім адлюстроўваўся грашовы баланс мытнай каморы. Іншая справа была з фіксаваннем партый дзяржаўных тавараў, якія праходзілі праз камору.

Наданне права арэнды на мыта магло быць вынікам задавальнення ініцыятывы прадпрымальніцка настоеных колаў грамадства. З іншага боку, нярэдка здаралася, што дзяржава такім чынам разлічвалася па пазыках, умовы якіх своечасова выканаць не магла. Так, напрыклад, здарылася ў 1518 г., калі Аўрааму Езафовічу за 4 тыс. коп грошай было нададзена права карыстацца берасцейскім мытам тэрмінам 8 год. Ён іх раней пазычыў скарбу. Мыта ўключала



каморы ў Дарагічыне, Гародні, Бельску, Камянцы, Мельніку і берасцейскія васкавыя і саляныя каморы. Каралеўская ўлада абяцала не турбаваць арандатара, не даваць безмытных лістоў гандлярам. А ў выпадку з'яўлення так званых «жалезных» лістоў кароль дазваляў складаць лічбу і дасылаць яе ў скарб. Прывядзём тыповы прыклад безмытнага ліста, які быў нададзены Азярышчыцкаму мешчаніну Ігнату Герасімовічу: «Товарами тыми, которыи за сто коп грошей стоили, торговати сухим путем и водным ездаючи, по всему тамошнему паньству нашому великому княству литовскому не даючи того мыта звыклаго и побору новоставленого и не платити торгового, подужного, важного от пописованых товаров его» [11, с. 61].

Але не прайшло і чатыры месяцы, і гэтае мыта атрымаў іншы арандатар — Міхел Шпіс. Апошні звярнуўся разам з Аўраамам Езафовічам да караля, каб той дазволіў каморы берасцейскія «сполом держати» (гэта значыць сумесна з Аўраамам плаціць за арэнду). Пры гэтым Міхел прапанаваў каралю павысіць арэндную плату на 300 коп грошай штогодна. Вярхоўная ўлада перадала права арэнды Шпісу. Грошы, якія дзяржава была павінна Аўрааму, павінен быў заплаціць Міхел Шпіс [10, с. 213].

Калі гандляр меў азначаны вышэй ліст, то грошы тут не браліся, але ж партыя усё ж фіксавалася. Складалася спецыяльная «квітанцыя». Мытнік павінен быў яе прадставіць у скарб дзеля запісу ў агульны разлік. У прыведзеным вышэй прывілеі ёсць яшчэ адзін цікавы факт. Згодна нададзенай арандатарам вольнасці суд над мытнікамі належаў толькі каралю [8, с. 87]. Мытныя каморы і прыкормкі былі не адзінымі месцамі за межамі гарадоў і мястэчак, дзе браліся падаткі на гандаль. У шэрагу дакументаў мы сустракаемся з «месцами звыклыми мытными». У беларускай гістарыяграфіі гэтаму паняццю вызначэння не даецца. У дакументах XVI — першай паловы XVII ст. яно толькі ўзгадваецца. Што гэта былі за ўстановы, хто ў іх працаваў — вызначыць цяжка. Але ж, хутчэй за ўсё, прынцыповай розніцы паміж імі і прыкормкамі не існавала. Аб гэтым сведчыць слова «звыклыя», гэта значыць — спрадвечныя, традыцыйныя, не маючыя якіх-небудзь навацый.

Вазы гандляроў маглі ехаць не па кожнай дарозе. Свабода абрання імі аптымальнага шляху была абмежавана існаваўшымі нормамі звычаёвага права і спецыяльнымі пастановамі вышэйшай улады. Апошнія вызначалі, хто з купцоў якімі дарогамі павінен карыстацца. Рабілася гэта дзеля рэгулявання колькасці гандляроў, што праязджалі праз мытныя каморы (а значыць і пакідалі тут грошы) і штучнага падтрымання «старых» дарог. Яны з пабудовай новых, больш зручных шляхоў гублялі сваю значнасць. Гэта, у сваю чаргу, прыносіла значныя страты арандатарам камор, якія знаходзіліся тут, а значыць і дзяржаве. На сойме 1551 г. была нават прынята пастанова аб забароне гандлярам ездзіць па новых дарогах (жыхарам асобных гарадоў і мястэчак былі вызначаны «рэкамендаваныя» для гандлёвых паездак шляхі) [4, с. 99].

У XVI ст. з'явіліся шляхі, якія злучалі Ліду і Вільна, Усвяты і Віцебск. У 1546 г. ёсць згадкі пра дарогу Бярэсце — Вітва — Ратна — Уладзімір — Луцк. Дастаткова было тры дні, каб даехаць ад Полацка да Невеля. У Баркулабаўскім летапісе ўзгадваецца дарога, якая злучала Магілёў і Шклоў: «И князь Иван Чарторыйский заехал от Шупень, дорогой великою шкловскою до Магилева тягнул» [9, с. 134]. На карце Беларусі канца XVI ст., якая складзена З. Ю. Капысскім, можна заўважыць ўжо добра разгалінаваную транспартную сетку. Асабліва добра відаць гэта ва ўсходняй, паўднёва-ўсходняй і заходняй частках. Адносна менш дарог было ў цэнтры і на поўдні. Але ж і тут былі буйныя тракты і дробныя рэчкі, якія садзейнічалі развіццю ўнутранага гандлю [11, с. 67]. Мытныя каморы мелі за мэту ажыццяўленне мытных збораў. Рэканструяваць гэты працэс нам дапамогуць мытныя кнігі, якія вяліся арандатарамі камор, ды вялікая колькасць вялікакняжацкіх прывілеяў, якія ўсталёўвалі ўмовы «гаспадарскае ласкі».

Купец, калі праязджаў праз камору, то павінен быў выканаць наступныя дзеянні. Па-першае, гандляр называў сваё імя, месца пражывання, маршрут паездкі (пункт адпраўкі і прызначэння), назву тавара і яго колькасць. Мытнік таксама запісваў назвы і колькасць транспартных сродкаў, якімі карыстаўся купец. Пасля гэтага апошні атрымліваў «квіт» —



пісьмовае сведчанне аб тым, што гандляр прайшоў камору. І толькі цяпер яму было дазволена працягваць сваю вандроўку [12, с. 65]. Але так адбывалася не заўсёды. Здараліся непаразуменні ці проста падман паміж бакамі. Купец мог аб'ехаць камору іншай дарогай (штраф за аб'езд камор ці ўхіл ад уплаты падатку называўся «прамыта»), схаваць частку тавара ад мытніка і г. д. Гэтай тэме прысвечана шмат судовых актаў, пастаноў вялікакняжацкай канцылярыі, соймаў, у якіх апісаны санкцыі адносна нядобрасумленных гандляроў [7, с. 54].

Такім чынам, хуткі рост унутранага гандлю на землях ВКЛ у XVI — першай палове XVII ст. меў за першапрычыну павышаны попыт на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы. За экспартаваны на Захад хлеб у зваротным накірунку на Усход ішоў паток грошай, у выніку чаго павялічвалася рэзка манетызацыя ўнутранага рынку ВКЛ. Прысутнасць вялікай колькасці наяўных грошай паскорыла развіццё ўнутрыдзяржаўных таварна-грашовых адносін, гэта знайшло сваё адлюстраванне у значным пашырэнні аб'ёмаў гандлёвых аперацый. Такі стан спраў выкарыстоўвала дзяржава ў сваіх фіскальных мэтах. Таму мы можам назіраць у гэты час рост колькасці мытных камор, але адсутнасць цэнтралізаванага бюракратычнага аппарату і сістэмы паліцэйскага прымусу ў краіне дазваляла многім гандлярам ухіляцца ад выплат мытных збораў. Асабліва гэта тычылася шляхты, якая ў той час была прывілеяваным саслоўем і кантралявала механізмы ўлады ў краіне, што дазваляла ёй заканадаўчымі сродкамі ўплываць на палітыку дзяржавы ў галіне гандлю і выкарыстоўваць яе ў сваіх саслоўных інтарэсах.

## ЛІТАРАТУРА

1. Акты, издаваемые Виленской комиссиею для разбора древних актов. Вильно, 1865—1915: в 39 т. Т. 5: Акты Витебской и Брестской магдебургии.
2. Акты издаваемые Виленской комиссиею для разбора древних актов. Вильно, 1865—1915: в 39 т. Т. 7: Акты Могилёвского магістрата.
3. Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссиею для разбора древних актов высочайше учреждённою при Киевском военном, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. Киев, 1859. Т. 1. 555 с.
4. Беларускія летапісы і хронікі. Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. 431 с.
5. *Бершадский, С. А.* Русско-Еврейский архив / С. А. Бершадский. СПб., 1872. Т. 2.

6. *Бродель, Ф.* Средиземноморье в эпоху Филиппа II / Ф. Бродель. Москва : Любомудр, 2002. Т. 2. 2689 с.
7. *Бурдзейка, А.* Нарыс сацыяльна-эканамічнага жыцця места Наваградку ў 16 ст. / А. Бурдзейка. Мінск, 1927. 181 с.
8. *Владимирский-Буданов.* Немецкое право в Польше и Литве. СПб., 1866. 304 с.
9. *Довнар-Запольский, М. В.* Очерки по организации западно-русского крестьянства в XXVI в. / М. В. Довнар-Запольский. Киев : 1-я артель печатного дела, 1905. 492 с.
10. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995. Т. 1. 219 с.
11. *Копысский, З. Ю.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в 16 — пер. пол. 17 в. / З. Ю. Копысский. Мінск : Наука и техника. 1966. 226 с.
12. Литовская Метрика. Мінск : Беларуская навука. 1997. 440 с.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ) у Мінску. Ф. 1705. Воп. 2. Спр. 7—9 — Брэсцкі гродскі суд.
14. *Риер, Я. Г.* Аграрный мир / Я. Г. Риер. Мінск : Беларуская навука. 2002. 442 с.

## SUMMARY

This article the problems of trade between the towns of the Great Duchy of Lithuania in the 16 th-firsit half of 17 th centuries and describes the development of commodity-money relations in Belarusianlands. This article is based on archival tittle-known materials.